# Сакратару ЦК КП(б)Б тав. Гікало

ПАВАЖАНЫ НІКАЛАЙ ФЁДАРАВІЧ!

Гэтым лістам я хацеў-бы звярнуць Вашу ўвагу на пытанне, якое датычыць перш за ўсё асабіста мяне, але якое, на мой погляд, мае і некатары агульны інтарэс.

Справа ідзе аб недапушчальным дзёрганні, проста такі драпежніцкім выкарыстанні некаторых членаў партыі. Каб не быць галаслоўным, я прывяду некаторыя даныя за апошнюю пяцідзёнку, якія датычаць асабіста мяне.

19/IV я атрымоўваю пуцёўку Гаркома абследваць хаванне партдакументаў. У той-жа дзень—пуцёўку рабіць даклад аб законе па барацьбе з беспрытульнасцю. 20/IV я атрымоўваю пуцёўку Культпропа ЦК абследваць стан краязнаўчай арганізацыі пры Акадэміі Навук. Тэрмін—25/IV. Пастановай бюро ЦК я вылучан палітрэдактарам Партвыдавецтва. На гэтай падставе 21/IV Партвыдавецтва даручае мне канчатковую рэдакцыю II тома выбраных твораў К. Маркса, усяго 35,5 друкаваных аркуша. Тэрмін—3 мая. 23/IV я атрымоўваю паведамленне аб неабходнасці к 29 выехаць у Рэчыцу для чытання даклада райпартактыву, куды я прымацаваны для сталай працы. Пастановай бюро ЦК я прызначан адным з рэдактароў Бел. Сов. Энцыклапедыі. Рэдакцыя апошняй даручае мне не пазней 27 IV адрэдагаваць мой аддзел. 25/IV я атрымоўваю пуцёўку Гаркома выехаць на пасеўную кампанію ў Халопеніцкі раён.

19/IV мяне выклікаюць к інструктару ЦК тав. Якубу, які вядзе са мной гутарку па пытанню аб прызначэнні пазаштатным інструктарам аддзела кір. парторганаў ЦК. І толькі што я зварочваюся на работу, як мяне выклікаюць у Культпроп да тав. Пасюкевіча. 25/IV мяне адначасова выклікаюць і ў Гарком за пуцёўкай і ў ЦК ЛКСМБ на нараду па невядомаму мне пытанню. Пры чым нікога не цікавіла, што 23/IV у мяне адкрылася ўсебеларуская нарада заг. кафедр педагагічных ВНУ, дзе я рабіў тэарэтычны даклад, што я застаўся адзін у апараце, бо мой намеснік і інспектары—на раёне, што я заняты складанейшай работай па перапрацоўцы вучэбных планаў, што ў мяне канчаецца навучальны год.

Я прывёў гэтую пяцідзёнку толькі ў якасці ілюстрацыі, але яна характэрна. І я не адзін у такім становішчы. Мне вядома, што рэктар БДУ, тав. Дзъякаў, дырэктар Пед'інстытута тав. Мельцэр нагружаюцца

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы